Падтрымай "Вясну" на PATREON

Затрыманні іператрусы ў Беларусі: хроніка палітычнага пераследу 25 і 26 лютага дапоўнена

26.02.2021 **Тэгі**: пераслед, затрыманні

25 і 26 лютага праваабаронцы "Вясны" працягваюць фіксаваць факты палітычнага пераследу ў Беларусі: затрыманні, вобшукі і іншыя формы ціску на грамадзянаў за іх актыўную грамадзянскую пазіцыю і незадаволеннасць дзеяннямі ўладаў.

Калі вас ці вашых блізкіх затрымалі, паведамляйце нам праз тэлеграм-бот @viasna_bot ці на гарачую лінію:

- **+375 44 734 45 51**
- **+375 29 835 94 49**
- Тэлеграм **@ViasnaSOS, @SOSViasna**

Пераслед 26 лютага

Раніца 26 лютага пачалася зператрусу ў рэдактара сайта “Віртуальны Брэст” **Андрэя Кухарчыка.** Пакуль вядома, што ў журналіста забіраюць тэлефон і кампутар, паведамляе тэлеграм-канал Беларускай асацыяцыі журналістаў. Падрабязнасці высвятляюцца.

Пазней БАЖ паведаміў, што паводле папярэдняй інфармацыі, гаворка ідзе пра "карагодную" справу, шукаюць фота. У Кухарчыка забралі кампутар, тэлефон і некалькі старых вінчэстараў.

У жніўні мінулага года "Віртуальны Брэст" трапіў у спіс рэсурсаў, доступ да якіх па загадзе Міністэрства інфармацыі быў заблакаваны на тэрыторыі Беларусі.

Як паведамілі праваабаронцам "Вясны", сёння ў 10:45 у момант выхаду з электрычкі на станцыі Мінск-Паўночны была затрыманая група пенсіянераў. Затрымлівалі людзі ў цывільным. Па словах відавочцы, затрымалі не менш за 8 чалавек, яны ў электрычцы чыталі беларускія кнігі — акцыя ў падтрымку беларускай мовы. Затрыманых даставілі ў Заводскі і Партызанскі РУУС, а потым на Акрэсціна. Сярод затрыманых:

1. **Галіна Гуленкова**

2. **Наталля Іванісава (1946 г.)**
3. **Святлана Лазебнікава (1961 г.)**
4. **Ірына Новік (1961 г.)**
5. **Ніна Несцяровіч (1961 г.)**
6. **Наталля Агейчык (1960 г.)**
7. **Алена Васільева (1955 г.)** - вызвалілі з ЦІП да суда
8. **Аксана Каратава (1954 г.)**
9. **Таццяна Шыманская (1961)**
10. **Раіса Алецкая** - вызвалілі з ЦІП да суда
11. **Іна Жаковіч**
12. **Алена Засценчык**
13. **Любоў Кучынская**
14. **Алена Лебядзінская**
15. **Вера Паршак**

Паведамляюць, што з ІЧУ на Акрэсціна выйшлі пенсіянеркі, якіх у пятніцу, 26 лютага, затрымалі на выхадзе з электравіка «Менск – Маладзечна». Сілавікі сустрэлі сталых людзей на платформе станцыі «Менск-Паўночны». У РУУС на іх склалі пратаколы паводле арт. 23.34. Падставай сталася чытанне ў цягніку кніг беларускіх пісьменнікаў. Сведкі казалі, што ў некаторых пенсіянерак былі з сабою бел-чырвона-белыя сцяжкі.

Пішуць, што затрымалі 26 асобаў. Міліцыянты зафіксавалі жанчын на відэа, а таксама далі зразумець, што побач з пенсіянеркамі быў ціхар. Некаторыя пенсіянеркі распавядаюць, што ў ІЧУ сядзелі ў камеры, дзе на 6 месцаў было 14 чалавек.

Суды над жанчынамі прызначылі на 1 сакавіка.

Пераслед 25 лютага

Увечары 25 лютага былі затрыманыя каля 10 чалавек у Мінску на вуліцы Нёманскай, 42. Там збіралі подпісы пад зваротамі, якія тычыліся добраўпарадкавання горада, адкрыцця межаў Беларусі на выезд, прадастаўлення аб'ектыўнай статыстыкі на COVID-19, з нагоды ЦЭЦ і "Табакерак". Аб'яву аб зборы подпісаў размясцілі ў адкрытым чаце. Затрыманых даставілі ў Фрунзенскае РУУС, а потым на Акрэсціна. Вядома пра затрыманне:

1. **Марыя Баран**
2. **Сяргей Барнюк**
3. **Таццяна Зайцава**
4. **Віталь Зайцаў**
5. **Алена Лабовіч**

6. **Валерый Халадзінскі**
7. **Дар'я Шабан**
8. **Алена Шумейка**

Над імі чакаюцца суды.

Раніцай у Лебяжым у сябе дома былі затрыманыя муж і жонка **Максім і Юлія Лакатковы**. ГУБАЗіК паведаміў, што затрымаў дзяўчыну, якая паведамляла інфармацыю блогеру Антону Матольку. Яе, як і іншых, прымусілі пакаяцца на фоне чырвона-зялёнага сцяга. **Юлія Лакаткова** – адна з ключавых асобаў у беларускай экасістэме стартапаў. Яна кіруе некалькімі IT-бізнесамі. Яе аштрафавалі ў Цэнтральным судзе на 40 базавых велічын нібы за непадпарадкаванне і адпусцілі на волю. Максім затрыманы, над ім чакаецца суд.

У Маладэчне 25 лютага каля 11:30 з дому забралі адну з затрыманых раней лыжніц — **Вольгу Квасаву.** Пратрымалі яе ў РАУСе да 17:00, пасля чаго адвезлі ў СК — інкрымінуюць артыкул 188 КК (паклёп). 22 лютага ў яе быў ператрус, у выніку якога забралі ноўтбук.

У суботу быў затрыманы відэаблогер **Руслан Ліннік** (каля 90 тыс. падпісчыкаў на YouTube), у хаце яго бацькоў быў праведзены ператрус. 25 лютага прэс-служба МУС паведаміла, што ён затрыманы за "абразу службовых асоб МУС".

> *"У кастрычніку мінулага года 38-гадовы жыхар Менска размясціў у сваім канале відэахостынгу ролік з абразамі прадстаўнікоў міліцэйскага ведамства. Пры гэтым мужчына доўгі час хаваўся. У лютым супрацоўнікі сталічнага ўпраўлення ГУУБ МУС затрымалі аўтара матэрыялу, нягледзячы на канспіратыўны лад жыцця і рэгулярную змену месца жыхарства.*
>
> *Следчыя далі прававую ацэнку дзеянням блогера і распачалі крымінальную справу за абразу прадстаўніка ўлады. Фігурант раскаяўся ў зробленым і прызнаў сваю віну",* — адзначаецца ў ведамстве.

Следчы камітэт паведаміў, што відэаблогер Руслан Ліннік заключаны пад варту.

Сілавікі прыйшлі з ператрусам у кватэру вядомага пластычнага хірурга **Аляксея Дзюжага**.

> *"Патэлефанаваў мне ўчора раніцай нейкі Лісіцкі і паведаміў, што ён з крымінальнага вышуку. Сказаў, што хоча са мной пабачыцца. Я яму патлумачыў, што ў Гомелі не жыву. Тады ён спытаў, хто жыве ў кватэры ў Гомелі. Там жыве бацька"*, — распавёў Аляксей выданню "Флагшток".

Учора ў абед да бацькі Аляксея прыйшлі з ператорусам: узялі панятых і агледзелі кватэру, у якой іх нічога не зацікавіла. Як паведаміў Аляксею яго бацька, ператорус звязаны са справай аб "масавых беспарадках 9-12 жніўня".

Вядома, што Аляксея затрымлівалі ў верасні падчас аднаго з маршаў у Мінску. У сацсетках ён адкрыта выказвае сваю грамадзянскую пазіцыю.

Інфармацыя дапаўняецца і абнаўляецца.

Твитнуть









"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Шлях да "Вясны". Як прыходзяць да праваабароны – новы выпуск падкаста

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць









ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY